www.etnolog.org.ua

# СУЧАСНЫЯ СЕЛЬСКІЯ ПАСЯЛЕННІ І ЖЫЛЛЁ БЕЛАРУСАЎ (канец ХХ – пачатак ХХІ стагоддзя)

**Галіна Каспяровіч**

**УДК 728.6(476)“19/20”**

У артыкуле аналізуюцца змены ў сельскіх паселішчах і жыллі беларусаў у Рэспубліцы Беларусь. Характарызуюцца сучасныя тыпы паселішчаў, іх размяшчэнне, групоўка па колькасці насельніцтва, паказана роля аграгарадкоў у сучасных этнакультурных працэсах. Разглядаюцца змены ў жыллі беларусаў, асаблівасці інтэр'еру. На матэрыялах анкетнага даследаванні выяўляецца стаўленне насельніцтва да новага жыллёвага будаўніцтва.

**Ключавыя словы:** паселішчы, тыпы паселішчаў, аграгарадкі, радавыя сядзібы, аграэкасядзібы, рассяленне, жыллё, асаблівасці інтэр'еру.

The article analyses changes in rural settlements and types of dwelling in the Republic of Belarus. The authoress describes modern types of settlement, their placement and types according to population amount, and characterizes agricultural settlements' role in today's ethno-cultural processes. The article also considers changes in Belarusian housing, including peculiar features of interior design, as well as on the basis of poll data shows current attitudes towards new types of dwelling.

**Keywords:** settlements, types of settlement, agricultural settlements, family estates, agricultural estates, resettlement, dwelling, peculiar features of interior design.

Пасяленні і жыллё складаюць важную частку сістэмы жыццезабеспячэння народа. Семантычна яны цесна звязаныя паміж сабой. Аднакарэнныя словы паселішча, сельбішча, сяліба, пасяленне, пасёлак як і жыллё, жыло, згодна тлумачальнага слоўніка У. І. Даля і «Тлумачальнаму слоўніку» беларускай мовы пазначалі заселеныя месцы, дзе жывуць людзі-сяляне, пасяляне. З часам за пасяленнем замацаваўся тэрмін населены пункт, а пад жыллём сталі разумець сядзібу — зямельны ўчастак у комплексе з хатай, гаспадарчымі пабудовамі, агародам, садам.

Беларусы, выбіраючы месца паселішча, зыходзілі з мэтазгоднасці і прыгажосці мясцовых ландшафтаў. Сяліліся пераважна на берагах маляўнічых азёр, рэк, якія забяспечвалі жыхароў вадой, разнастайнай рыбай, служылі вадапоем для жывёлы, звязвалі паселішча з бліжэйшымі і далёкімі гарадамі і весямі. Важнымі для пасялян былі асаблівасці рэльефу мясцовасці, клімату, урадлівасць глеб, прыдатных для земляробства і жывёлагадоўлі, багацце флоры і фауны. Асноўныя тыпы сельскіх паселішчаў беларусаў сфармаваліся ў Х–ХІ ст. і прайшлі доўгі шлях развіцця. На іх эвалюцыю паўплываў цэлы комплекс фактараў — прыродныя ўмовы, сацыяльная арганізацыя грамадства, накіраванасць гаспадарчай дзейнасці, склад і колькасць насельніцтва. Да найбольш ранніх паселішчаў адносяць пагост (Х–ХІ ст.), Першапачаткова ён выконваў функцыі падатковай адзінкі, пазней — цэнтра супольнасці, у якім размяшчаліся царква, могілкі, двор святара, заезны двор, карчма. Да ХІХ ст. пагост пераўтварыўся ў відавы тапонім (Пагост, Новы Пагост), яго назва захоўваецца за царкоўнай сядзібай з могілкамі.

З ХІ ст. вядома сяло, якое як тып паселішча часта згадваецца ў летапісных дакументах. Сяло пакрысе з вотчынага валодання пераўтварылася ў адміністрацыйна-тэрытарыяльны цэнтр з царквой, школай, валасной управай або земствам, запасной крамай, карчмой, выконвала гаспадарчыя, адміністрацыйныя, адукацыйныя і духоўныя функцыі. Абагульняючыя назвы «сяло», «сельскія пасяленні» шырока распаўсюджаны ў сучаснай размоўнай і пісьмовай рускай мове беларусаў. Сустракаюцца шматлікія тапонімы «Сяло», часта з тлумачальнымі азначэннямі, якія даюць уяўленне аб велічыні паселішчаў, часу ўтварэння, характары

www.etnolog.org.ua



мясцовасці, прыналежнасці: Вялікае Сяло, Малое Сяло, Старое Сяло, Новае Сяло, Дворнае Сяло, Краснае Сяло, Крывое Сяло, Лёшкава Сяло, Рускае Сяло, Роднае Сяло і інш. У Рэспубліцы Беларусь налічваецца больш за 60 населеных пунктаў з назвай «Сяло», амаль палова іх сканцэнтравана ў Віцебскай вобласці [12, с. 274–286; 13, с. 525–559; 14, с. 330–343; 15, с. 386–411; 16, с. 342–359; 17, с. 507–537].

У беларускай тапаніміцы захаваліся вытворныя ад слова сяло назвы: «Сялец», «Селішча» (найбольш старажытныя паселішчы), і шматлікія тапонімы «Селко», «Сяльцо», якія пазначаюць у асноўным невялікія пасяленні.

Тэрмін «дзярэўня» з'яўляецца ў пісьмовых крыніцах з XIV ст. Аднак, на думку даследчыкаў, пасяленні такога тыпу вядомыя значна раней. Верагодна назва паходзіць ад слова «дзерці» — араць, падымаць цаліну, расчышчаць зямлю ад лесу [4, с. 97]. Дзярэўні ў адрозненне ад сёл былі невялікімі, маладворнымі і не мелі царквы. У цяперашні час захаваліся рэдкія тапонімы «Дзярэўня» (Віцебская вобласць) і вытворныя ад слова «дзярэўня»: «Дзеравушка» (Гарадоцкі раён, Віцебская вобласць), магчыма «Дзераўная», «Дзераўно», «Дзярэчына», «Дзерць» (Мінская вобласць). Тэрмін «дзярэўня» шырока выкарыстоўваецца ў размоўнай і пісьмовай мове.

Разам з сялом і дзярэўняй да асноўных тыпаў сельскіх паселішчаў адносіцца «вёска». Назва яе паходзіць ад старажытнаславянскага «въсь», якое прысутнічае ў мовах усіх славян. У цяперашні час «вёска», «вясковы» у літаратурнай беларускай мове пазначае ўсе сельскія пасяленні. Тапонім «Вёска» ёсць у Мінскай вобласці, чатыры пасяленні «Новая Вёска» знаходзяцца ў Віцебскай і адно ў Гомельскай абласцях.

З XVI ст. сфарміраваліся новыя тыпы маладворных пасяленняў, якія размяшчаліся за ваколіцамі старых паселішчаў — засценак, авулек, аколіца, у якіх пражывала шляхта, а таксама невялікі маёнтак па вытворчасці таварнага хлеба — фальварак.

У пісьмовых крыніцах з X ст. згадваюцца селішча «слабада» (таксама «слабодка»). Больш інтэнсіўнае развіццё яны атрымалі ў феадальную эпоху (XIV–XVI ст.). На тэрыторыі Беларусі яны былі пераважна земляробчымі, насельніцтву іх падавалі пэўныя льготы на засваенне нязручных, незаселеных земель. Свабодныя землі асвойвалі як мясцовыя сяляне, так і стараверы, якія перасяліліся з Расіі. Назва ўзыходзіць ад агульнага для трох усходнеславянскіх моў слова слабада («Воля», «Асада на слабаду»). Амаль кожная другая «Слабада» мае падвойную назву, якая паказвае на гаспадарчыя сувязі з больш старым паселішчам (Бракава Слабада і вёска Бракава, Зайцава Слабада і в. Зайцава Магілёўскай вобласці), на прыналежнасць вызначанай асобе (Грыбава Слабада Магілёўскай, Кішчына Слабада Мінскай абласцей), на велічыню і даўнасць утварэння паселішча (Вялікая Слабада, Малая Слабада, Старая Слабада, Новая Слабада), асаблівасці мясцовасці (Лугавая Слабада, Верхавая Слабада). Слабодка азначала невялікую па колькасці насельніцтва слабаду. Паселішчы з назвамі Слабада і Слабодка лакалізаваны пераважна ў паўночна-ўсходніх і цэнтральных раёнах краіны. Усяго ў Рэспубліцы Беларусь налічваецца больш за сто трыццаць паселішчаў з назвай «Слабада» [7, с. 348, 349].

Адным з тыпаў пасяленняў былі сядзібы («маёнтак») буйных землеўладальнікаў, шляхты, дваран, якія нярэдка размяшчаліся асобна ад сел. Першапачаткова гэта былі ўмацаваныя равамі і абарончымі збудаваннямі памешчыцкія, шляхецкія, баярскія двары з домам, гаспадарчымі пабудовамі, садам і паркам. У багатых землеўладальнікаў мелася некалькі галоўных і другарадных двароў, часам рознага гаспадарчага прызначэння (для палявання, рыбалоўства, двары-фермы). На тапанімічнай карце Беларусі захаваліся шматлікія паселішчы з назвай Двор, Белы Двор, Вялікі Двор (магчыма, у сэнсе знакаміты, багаты, саноўны), Стары Двор, Новы Двор, Малы Двор. Сляды былых двароў прасочваюцца і ў назвах сельскіх паселішчаў Новадвор'е, Новадворцы, Старадворцы, Двор-Астрагляды, Двор-Гарадзішча, Двор-Гарбацэвічы, Задвор'е, Задваране, Задворцы і іншых.

www.etnolog.org.ua



У канцы XIX — пачатку XX ст. былі распаўсюджаны хутары. Павелічэнне колькасці хутароў было звязана са сталыпінскай рэформай 1906—1911 гг. Перасяленне на хутары працягвалася і ў 1920-я гады. Гэты працэс стымуляваўся палітыкай Наркамзема БССР, накіраванай як на захаванне ранейшых хутароў, так і стварэнне новых.

Істотная трансфармацыя сельскіх паселішчаў адбылася на рубяжы 1920—1930-х гадоў. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі і звязаныя з ёй сацыяльныя пераўтварэнні суправаджаліся зменамі ў характары рассялення, планіроўцы і забудовы сядзібаў. З развіццём калектыўных гаспадарак змянілася сацыяльна-эканамічная сутнасць сельскіх паселішчаў. Зніклі многія хутары, засценкі, аколіцы, фальваркі, двары (маёнткі), слабодкі. Яны былі ўключаныя ў больш буйныя вёскі і новыя пасёлкі (Навасёлкі, Новаселле). Першапачаткова новыя паселішчы, у асаблівасці іх грамадскія пабудовы, ўзводзілі па ўласных планах з мясцовых матэрыялаў. У далейшым будаўніцтва вялося па загадзя распрацаваных праектах, выкананых прафесійнымі архітэктарамі. У цэнтры паселішчаў размяшчаліся адміністрацыйныя будынкі (кіраванне калгаса, саўгаса, сельсавета), культурныя аб'екты (школа, клуб, бібліятэка), гандаль і абслугоўванне, на ўскраінах — гаспадарчыя пабудовы (жывёлагадоўчыя фермы, склады). У адпаведнасці з Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 27 верасня 1938 г. «Аб класіфікацыі населеных пунктаў Беларускай ССР», большасць мястэчак было ператворана ў гарады, пасёлкі гарадскога тыпу. Астатнія атрымалі статус сельскага пасялення.

Разглядаючы змены ў пасяленнях і жыллі, нельга не ўлічваць ўплыў Вялікай Айчыннай вайны, падчас якой значна пагоршыліся жыллёвыя ўмовы насельніцтва. Падчас вайны нямецкія акупанты разбурылі 209 беларускіх гарадоў і раённых цэнтраў, 9200 вёсак і сёл, правялі больш за 140 карных аперацый, падчас якіх спалілі 628 вёсак разам з жыхарамі (у тым ліку в. Хатынь, памяць пра якую ўвекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь»). У пасляваенны час на месцы большасці разбураных вёсак пабудаваны новыя. Адрадзіліся беларускія гарады. Аднавіўшы разбураную вайной гаспадарку, Беларусь уступіла ў новую паласу свайго развіцця. Значныя змены адбыліся ў жыллёвым будаўніцтве, ва ўпарадкаванні сельскіх і гарадскіх паселішчаў. Разам з тым большасць сельскіх населенных пунктаў захоўваюць свае спрадвечныя назвы. У гутарковай мове беларусаў гучаць словы вёска, сяло, дзярэўня, слабада, слабодка, пасёлак, мястэчка. Маланаселеныя пасяленні жыхары называюць хутарамі.

Асабліва вялікія змены ў пасяленнях і жыллі адбыліся ў найноўшы перыяд (канец XX — пачатак XXI ст.). У Рэспубліцы Беларусь значная ўвага надаецца развіццю сельскіх паселішчаў, іх планіроўцы, абнаўленню жылога фонду, выкарыстанню новых канструктыўных і планіровачных рашэнняў. У Нацыянальнай жыллёвай праграме (1996), было прадугледжана будаўніцтва ў гаспадарках 4—5 сядзібных жылых дамоў штогод. У ходзе рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі на 2005—2010 гады з'явіліся якасна новыя тыпы сельскіх пасяленняў — аграгарадкі. Статус аграгарадкоў атрымалі каля 1500 сельскіх паселішчаў. Яны ствараліся на базе існуючых адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак — цэнтраў сельскіх саветаў, цэнтральных сядзіб сельскагаспадарчых арганізацый. У лік аграгарадкоў былі ўключаныя і невялікія паселішчы гарадскога тыпу: Крывічы Мядзельскага, Халопенічы Крупскага, Антопаль Драгічанскага раёнаў [3, с. 22—24].

Важнае месца ў праграме адводзілася сацыяльнай сферы, у тым ліку будаўніцтву жылля. Забудова, як правіла, ажыццяўлялася дамамі-сядзібамі з абавязковымі гаспадарчымі і дапаможнымі памяшканнямі, участкамі зямлі. Адначасова вялася рэканструкцыя і засяленне пустуючых дамоў. Вялікая ўвага надавалася добраўпарадкаванню вёсак (забеспячэнне прыродным газам, пітной вадой, электраэнергіяй). У сацыяльнай сферы важнае значэнне надавалася стварэнню амбулаторый агульнай

www.etnolog.org.ua



урачэбнай практыкі з абслугоўваннем насельніцтва ў радыусе 10—15 кіламетраў і ўкамплектаванню медыцынскіх установў на сяле спецыялістамі агульнай урачэбнай практыкі; адкрыццю пры сельскіх агульнаадукацыйных школах філіялаў дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ, а таксама арганізацыі якасна новых тыпаў сельскіх установў культуры — дамоў сацыяльна-культурных паслуг, цэнтраў рамёстваў, фальклору, сядзібна-этнаграфічных турыстычных комплексаў, аднаўленню дзейнасці перасоўных бібліятэк і інш.

Непазнавальна змянілася аблічча малых гарадоў і аграгарадкоў. Яны папрыгажэлі і набылі свае непаўторныя рысы. Штогод да абласных «Дажынак», а раней да рэспубліканскіх уладкоўваюцца чарговыя раённыя цэнтры. Абнаўленне малых гарадоў, пасёлкаў і сельскіх населеных пунктаў звязана таксама з іх юбілеямі, на ўрачыстае святкаванне якіх вылучаюцца дзяржаўныя сродкі. У малых гарадах і аграгарадках праводзіцца рэканструкцыя гісторыка-архітэктурных каштоўнасцяў, вядзецца новае будаўніцтва грамадскіх будынкаў — вакзалаў, бібліятэк, Палацаў культуры, музеяў, спартыўных комплексаў і гандлёвых цэнтраў, адміністрацыйных будынкаў, ствараецца спрыяльнае асяроддзе для пражывання, якое ўключае таксама паркі і скверы, кветкавыя клумбы і фантаны, дзіцячыя пляцоўкі і гарадкі.

Важнейшым прынцыпам планіровачнай арганізацыі сельскага населенага пункта з'яўляецца функцыянальнае занаванне тэрыторыі, якая ўключае дзве асноўныя зоны: селітэбную і вытворчую [10, с. 44—49]. Як правіла, у цэнтры аграгарадкоў размяшчаюцца адміністрацыйныя будынкі, адукацыйныя, культурныя і лячэбныя ўстановы, гандлёвыя комплексы, культавыя збудаванні. Яны выступаюць знакавымі дамінантамі, арганізуюць рукатворную і прыродную прастору. Важная роля ў аднаўленні, развіцці і папулярызацыі традыцый у народнай культуры беларускага народа належыць установам культуры, у першую чаргу, новым тыпам — Дамам і Цэнтрам рамёстваў, народнай творчасці, фальклору. Яны вядуць шырокую пошукавую дзейнасць, праводзяць фальклорна-этнаграфічныя экспедыцыі, збіраюць аўтэнтычны фальклорны матэрыял, які паспяхова выкарыстоўваюць у правядзенні масавых святаў і розных мерапрыемстваў, спрыяюць аднаўленню цэнтраў традыцыйных рамёстваў, падтрымліваюць народных майстроў, у асаблівасці носьбітаў аўтэнтычнага фальклору, аднаўляюць народныя касцюмы беларусаў у іх лакальнай разнастайнасці. Дастаткова сказаць, што толькі ў Мінскай вобласці на абласны конкурс па аднаўленні народнага касцюма з 21 раёна былі прадстаўлены традыцыйныя комплексы мужчынскага, жаночага адзення (паўсядзённыя і святочныя), вясельныя і дзявочыя касцюмы, вясельныя вянкі (2011). Асобныя аграгарадкі сталі цэнтрамі прэстыжных, відовішчных фестываляў народнай творчасці. У аграгарадку Ляскавічы Гомельскай вобласці шырока вядомы Міжнародны фестываль этнакультурных традыцый «Покліч Палесся». З кожным годам расце папулярнасць кулінарнага фестывалю «Мотальскія прысмакі» (аграгарадок Моталь, Брэсцкая вобласць). Маштабны фестываль народнай культуры «Купалле» — «Александрыя збірае сяброў» штогод праходзіць у аграгарадку Александрыя Магілёўскай вобласці і інш.

Калі раней у архітэктурна-кампазіцыйным фарміраванні селітэбных зон буйных сельскіх населеных пунктаў пануючая роля адводзілася 2—5 павярховым жылым дамам секцыйнай забудовы, якія размяшчаліся ў цэнтры паселішчаў, а сядзібы выносіліся на перыферыю населеных пунктаў, то ў цяперашні час новыя сядзібныя комплексы размяшчаюцца і ва ўжо існуючай забудове. Сучасная архітэктура і прывабнае каляровае рашэнне з'яўляюцца свайго роду візітнай карткай аграгарадкоў [11, с. 17]. На падворках сельскіх жыхароў размяшчаюцца гаспадарчыя і падсобныя будынкі, у якіх вырошчваюць хатніх жывёл, птушку, захоўваюць інвентар. Падсобныя гаспадаркі насельніцтва вырабілі ў 2015 годзе кожнае чацвёртае яйка, 6,0 % малака, 6,1 % мяса ад агульнай колькасці, што выпрацоўваецца ў краіне.

www.etnolog.org.ua



Нягледзячы на пэўнае памяншэнне колькасці жывёлы і птушкі і ўдзельнай вагі прадукцыі, якая выпрабляецца, хатнія жывёлы, па сведчанні рэспандэнтаў, займаюць важнае месца як у забеспячэнні экалагічна чыстымі прадуктамі харчавання, так і ў семіятычнай прасторы сельскіх пасяленняў [20, с. 148, 149].

Вытворчыя будынкі аграпрамысловых комплексаў размяшчаюцца за межамі паселішчаў. У вытворчай зоне праводзяцца маштабныя работы па мадэрнізацыі дзеючых, рэканструкцыі і будаўніцтву новых аб'ектаў аграпрамысловага комплексу — малочна-таварных ферм, майстэрняў, агароднінасховішчаў, перапрацоўчых прадпрыемстваў. Як адзначыў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка: «...аграгарадкі <...> стануць асновай аграіндустрыі ў нашай краіне».

У якасці помнікаў сядзібна-паркавай архітэктуры ў сельскім асяроддзі захаваліся асобныя дваранскія сядзібы ў комплексе з гаспадарчымі будынкамі, прыгожымі паркамі, вадаёмамі. Многія з іх рэстаўраваны, выконваюць функцыі дзеючых гісторыка-краязнаўчых, мастацтвазнаўчых музеяў. Супрацоўнікі іх праводзяць экспедыцыйна-палявыя даследаванні, ствараюць картатэкі народных майстроў, папаўняюць фонды рарытэтамі матэрыяльнай і духоўнай спадчыны беларусаў (традыцыйнае адзенне, ручнікі, аўдыё- і відэазапісы фальклорных калектываў і інш.). Музеі традыцыйна прымаюць удзел у арганізацыі і правядзенні масавых імпрэзаў, фестываляў. Падчас падрыхтоўкі і правядзення гэтых святаў яны актыўна супрацоўнічаюць з калектывамі мастацкай самадзейнасці, носьбітамі народных традыцый. Вельмі важнай і патрэбнай з'яўляецца дзейнасць па выхаванню дзяцей і падлеткаў на традыцыях папярэдніх пакаленняў, што спрыяе фарміраванню этнічнай самасвядомасці, патрыятызму, любові да сваёй Айчыны.

У культурнай прасторы сельскіх пасяленняў размешчаны помнікі і мемарыялы ў гонар загінуўшых воінаў, партызан, аднавяскоўцаў. Жыхары вёсак шануюць памяць тых, хто абараніў гонар і незалежнасць Радзімы: падтрымліваюць у належным парадку брацкія магілы, фарбуюць помнікі, агароджы, саджаюць кветкі і дрэвы. У знакавы для ўсяго народа Дзень Перамогі праводзяць мітынгі, ускладанне вянкоў.

У сельскіх паселішчах як помнікі архітэктуры і гісторыі захаваліся асобныя цэрквы, касцёлы, капліцы, прыдарожныя крыжы. З канца 1990-х гадоў, дзякуючы аднаўленню храмавага будаўніцтва, з'явіліся новыя культавыя збудаванні, якія маюць як традыцыйныя, кананічныя рысы, так і варыятыўныя, якія ўлічваюць новыя тэхналогіі і матэрыялы. Збудаванне іх абапіраецца на прынцыпы старажытнага беларускага дойлідства: «як мера і прыгажосць скажуць». Храмавая стылістыка змяняецца ў сувязі з сацыяльна-эканамічнымі пераўтварэннямі, новымі павевамі моды, праектаваннем храмаў прафесійнымі архітэктарамі. У шмат якіх беларускіх вёсках, асабліва буйных, з вялікай колькасцю насельніцтва пабудаваны або аднаўлены цэрквы і касцёлы. Як і раней, яны становяцца этнакультурнымі маркерамі прасторы сельскіх паселішчаў. Іншыя сталі месцамі наведвання паломнікаў не толькі з Беларусі, але і з Расіі, Польшчы і іншых краін. У культурнай прасторы пасяленняў аднаўляецца і сістэма легітымізацыі іх межаў. На ўездзе і выездзе з вёскі ставяць прыдарожныя крыжы, якія, па народных уяўленнях, абараняюць ад усялякіх пошасцяў і негатыўных уплываў.

Як і раней, на ўзвышшах, адкрытых погляду вандроўніка, сярод палёў і лугоў добра праглядаюцца сельскія могілкі, часам з драўлянай капліцай або могілкавай царквой, абсаджаныя дрэвамі. Дрэвы характэрныя і для паселішчаў беларусаў. Векавыя бярозы, таполі, ліпы ўпрыгожваюць вясковыя вуліцы. Па суседстве з домам вясной пахне бэз, чаромха, расцвітаюць каліна, рабіна, акацыя, шыпшына. У народных уяўленнях, дрэвы і хмызнякі як частка жывой прыроды валодаюць уласцівасцямі абярэгаў, як бы звязваюць неба з зямлёй. Выкарыстоўвалі іх таксама і ў лячэбна-магічнай практыцы.

На тэрыторыі Беларусі ствараюцца ўмовы для развіцця сельскіх паселішчаў — аграсяд-

www.etnolog.org.ua



зібаў, фермерскіх сядзібаў, экапаселішчаў, што адпавядае традыцыям шматвяковай гісторыі беларускага народа. У цяперашні час у краіне дзейнічае 2263 аграсядзібы. Фарміраванне сядзіб сельскага турызма адбываецца на базе існуючых традыцыйных будынкаў, а таксама новага будагніцтва, якое ўлічвае традыцыі народнага дойлідства [21, с. 501–505]. Важнае значэнне маюць аграсядзібы ў павелічэнні занятасці, даходаў, павышэнні якасці жыцця сельскага насельніцтва. Не менш значная іх роля ў падтрыманні спрыяльнай экалогіі, паколькі традыцыйны сельскі ўклад грунтуецца на безадходнай, экалагічна чыстай вытворчасці, што спрыяе беражлівым адносінам да зямлі і свойскіх жывёлаў. У многіх аграсядзібах займаюцца гаспадарчай дзейнасцю (разводзяць хатніх і экзатычных жывёл), выкарыстоўваюць экалагічныя прадукты харчавання, у сваёй аснове традыцыйныя для рэгіёну, якія становяцца своеасаблівым маркерам, брэндам сядзібы. Для прыцягнення турыстаў арганізуюць паходы і экскурсіі па экалагічных сцежках, у музеі, запрашаюць майстроў народнай творчасці, фальклорныя калектывы. Аграсядзібы садзейнічаюць аднаўленню і развіццю лакальных комплексаў культуры.

У Беларусі налічваецца каля 500 сем'яў, якія ствараюць радавыя сядзібы. Сярод найбольш буйных экапаселішчы — Росы Валожынскага, Звонкія ручаі Нясвіжскага, Звон-Гара Віцебскага, Дружная Нарачанскага раёнаў. Жыхароў экапаселішч, у большасці былых гараджан, аб'ядноўваюць духоўныя каштоўнасці. Галоўным прынцыпам жыхароў экапаселішч з'яўляецца ўзаемадзеянне з прыродай, зніжэнне негатыўнага ўплыву чалавека на навакольнае асяроддзе. Жыхары займаюцца экстэнсіўным земляробствам, рамёствамі, разводзяць хатніх і экзатычных жывёл, будуюць жыллёвыя і гаспадарчыя пабудовы з экалагічна чыстых матэрыялаў (драўляныя дамы). У сяле Росы вось ужо 14 гадоў жывуць былыя менчукі — бізнесмены, спецыялісты па інфармацыйных тэхналогіях, урачы, настаўнікі, студэнты. Аляксандр Матруковіч, які стаяў ля вытокаў Росаў, адзначае перавагі жыцця ў ладу з прыродай: «Тут дыхаецца зусім не так, як у горадзе. І дзецям у маёнтку непараўнальна лепш. Яны з суседнімі хлопцамі з раніцы да вечара гуляюць на вуліцы. Шалашы будуюць, купаюцца нават зімой у сажалцы, ходзяць басаною, збіраюць грыбы, ягады». Жыхары экавёсак выкарыстоўваюць экалагічна чыстую прадукцыю, носяць экаадзенне з лёну ці бавоўны, адзначаюць традыцыйныя каляндарныя святы, запрашаючы на святы і гасцявыя дні жыхароў з навакольных вёсак. Экапаселішчы па сваёй гаспадарчай і культурнай дзейнасці падобныя да традыцыйных сельскіх вёсачак, асабліва невялікіх і нешматлікіх [6, с. 1, 9].

З старажытнасці вядомы сельскія пасяленні з бессістэмнай (хаатычнай, кучавой) забудовай. Цяпер яна яшчэ захавалася на паўночным усходзе Беларусі, часткова існуе яшчэ лінейная планіроўка. З XVI ст. распаўсюдзілася сістэмная вулічная і шматвулічная забудова, якая ў цяперашні час пераважае [8, с. 26–31]. Сельскія паселішчы Беларусі маюць неаднолькавыя памеры. У цэнтральных і паўднёвых раёнах Беларусі яны застаюцца значна большымі, чым на поўначы. Па распаўсюджанасці малых альбо буйных паселішчаў А. І. Лакотка вылучае на тэрыторыі Беларусі тры рэгіёны: Палескі з перавагай буйных многадворных паселішчаў з колькасцю двароў звыш 300; Сярэднебеларускі з колькасцю двароў каля 100–300; Паазер'е, для якога характэрныя малодворныя паселішчы [2, с. 24–25; 9, с. 224].

Развіццё механізацыі і аўтаматызацыі аграрнай вытворчасці, інфарматызацыі сельскай прасторы спрыяюць паглыбленню і пашырэнню працэсаў урбанізацыі сельскага рассялення. У сувязі з гэтым ідзе пераразмеркаванне колькасці насельніцтва па сельскіх населеных пунктах рознай велічыні. Статыстычныя матэрыялы па групоўцы сельскіх населеных пунктаў па ліку жыхароў паказваюць, што з 1989 па 2009 гг. павялічылася колькасць малых вёсак з колькасцю насельніцтва 10 і менш; 11–25 чалавек, агульная колькасць насельніцтва ў

www.etnolog.org.ua



іх ўзрасла адпаведна ў 1,8 і 1,2 разы. За гэты перыяд назіраўся рост самых буйных паселішч з колькасцю насельніцтва звыш 5000 чалавек (з 8 да 10 паселішчаў), колькасць іх насельніцтва павялічылася з 52376 да 77639 чалавек (гэта значыць, у 1,5 разы). Лік сярэдніх па велічыні вёсак як і агульная колькасць іх насельніцтва зменшылася [22, с. 64].

Адным з найважнейшых прыярытэтаў дзяржавы з'яўляецца будаўніцтва, і перш за ўсё жыллёвае. Характэрна, што аб'ёмы будаўніцтва жылля пастаянна нарошчваюцца. Дастаткова сказаць, што калі ў сельскіх населеных пунктах ў 2000 годзе пабудавана 1081,1 тыс. кв. м жылля, то ў 2015 г. — 1511,1 тыс. У сельскай мясцовасці ў 2015 годзе пабудавана 5,3 кватэры на 1000 чалавек насельніцтва [22, с. 336–340]. Дзяржава ўзяла на сябе місію па будаўніцтве якаснага і даступнага жылля, што выяўлялася ў павелічэнні аб'ёмаў ільготнага крэдытавання (60 % ад агульнага аб'ёму жылля ў 2008 г.), прыняцці мер па зніжэнні коштаў на будаўнічыя матэрыялы, скарачэнні тэрмінаў будаўніцтва, памяншэнні кошту аднаго квадратнага метра жылля. А для будаўніцтва жылля ў сельскай мясцовасці, пераважна ў аграгарадках, было распрацавана 66 тыпавых праектаў. У той жа час карыстаецца попытам індывідуальнае праектаванне. Так, па індывідуальных праектах ажыццяўлялася будаўніцтва ўздоўж асноўных магістраляў Беларусі. Паказальна, што аб'ёмы будаўніцтва павялічваюцца як за кошт кааператыўнага і долевага будаўніцтва, так і індывідуальнага. Індывідуальным забудоўшчыкам прадастаўлена на Беларусі 65 тысяч участкаў зямлі. Пастаяннае ўдасканаленне будаўнічай галіны прыводзіць да з'яўлення новай тэхнікі, тэхналогій, матэрыялаў. Практычна ўсе матэрыялы, неабходныя для жыллёвага будаўніцтва, выпускаюцца ў нашай краіне. Сярод матэрыялаў з'явіліся новыя тыпы пліт пустотнага насцілу, каркасаў для будынкаў, элементаў запаўнення сцен (парызаваная цэгла, газасілікатныя і керамзітабетонныя блокі), новыя віды шкла, керамікі, цеплаізаляцыі і фасадных матэрыялаў (керамаграніт, вентыляваныя фасады і г. д.). Планіроўка кватэр самая розная — ад жорсткай да свабоднай. На 01/01/2015 г. на кожнага жыхара нашай краіны прыпадала ў сярэднім 26,5 кв. м жылой плошчы, а на кожнага сельскага жыхара — 35,7 кв. м. Сельскі жыллёвы фонд у 2015 годзе склаў 76,1 млн квадратных метраў, з іх 5,4 адсоткаў належыць дзяржаве, большая ж частка яго знаходзіцца ва ўласнасці сельскіх жыхароў. За 2000–2015 гады ў сельскіх паселішчах палепшылі свае жыллёвыя ўмовы 43,9 тыс. сем'яў. За гэты перыяд значна палепшылася добраўпарадкаванне жылля. Амаль у два разы павялічылася ўдзельная вага агульнай плошчы, абсталяванай вадаправодам, каналізацыяй, цэнтральным ацяпленнем. Практычна ўвесь жылы фонд забяспечаны газам (94,6 %), на 32,6 % гарачым водазабеспячэннем. У асобных сельскіх дамах устаноўлены ванны ці душ. Некаторыя сем'і маюць электраплiты [22, с. 127–129].

У Дзяржаўнай праграме «Будаўніцтва жылля» на 2016–2020 гады прыярытэтным напрамкам з'яўляецца развіццё індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва, прычым яго доля да 2020 года будзе даведзена да 40 % у агульным аб'ёме жыллёвага будаўніцтва. Пад індывідуальную забудову плануецца прадаставіць зямельныя ўчасткі з забеспячэннем іх інжынернай інфраструктурай (газазабеспячэнне, водазабеспячэнне, энергазабеспячэнне), уключаючы размешчаныя і ў сельскай мясцовасці. Мэтай Дзяржаўнай праграмы з'яўляецца павышэнне ўзроўню забяспечанасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь даступным і якасным жыллём. Сучаснае сельскае жыллё развіваецца па двух напрамках: 1) удасканаленне і развіццё традыцыйнага тыпу індывідуальнага дома і 2) забудова вёскі новымі тыпамі жылля: пераважна дамамі сядзібнага тыпу палепшанай планіроўкі. Сялянская хата, захоўваючы традыцыйныя асаблівасці — канструкцыю, ўпрыгожанні, арыентацыю тарцом да вуліцы, інтэнсіўна ўспрымае навацыі. Нароўні з драўлянымі дамамі ў вёсцы будуюцца дамы з цэглы і дробнаштучных блокаў. У будаўніцтве жылля

www.etnolog.org.ua



ўжываюць самыя розныя тэхналогіі: зрубная, каркасная, таксама тэхналогіі, якія ўлічваюць найноўшыя дасягненні будаўнічай навукі і практыкі. У будаўніцтве выкарыстоўваюцца дробнаштучныя будаўнічыя матэрыялы, драўляныя канструкцыі (зрубы, клеены брус, пакетныя драўляныя элементы), мадэрнізаваная каркасная тэхналогія на аснове сталёвых танкасценных канструкцый і інш.

Найстаражытнымі тыпамі планіроўкі двароў былі вяночны, у якім усе пабудовы злучаліся ў «вянок», і пагонны, у якім хату ставілі тарцом або пад вуглом да вуліцы, а гаспадарчыя пабудовы размяшчалі ў адну лінію (пагон) за хатай. У другой палове XIX ст. з'явіліся новыя тыпы сядзібнай планіроўкі: П-падобны, 2-радны, Г-падобны і з незвязанымі пабудовамі.

Самай старажытнай канструкцыяй будынкаў была стаўбавая, паступовa яе замяніла зрубнае жыллё, якое ў цяперашні час пераважае ў вёсках. Для будаўніцтва звычайна выкарыстоўваюць характэрныя для сярэдняй паласы хвойныя пароды дрэў, найбольш часта сасну.

Народныя веды, багаты вопыт, уменні, творчы падыход да справы дапамагалі выбраць аптымальнае месца жылля (улічваліся размяшчэнне ў адносінах да бакоў свету, да сонца, ружа вятроў, грунтавыя воды і інш.). У сучасных умовах на новым узроўні з улікам цэлага комплексу фактараў праводзіцца аналіз будаўнічых праектаў. Пры праектаванні сістэм інжынерных камунікацый і падрыхтоўцы да будаўнічых прац выкарыстоўваюцца спецыялізаваныя геаінфармацыйныя сістэмы, што дазваляе выбраць ўчастак пад будаўніцтва з улікам аддаленасці ад прамысловых зон, характарыстыкі глебы, глыбіні залягання грунтавых вод і інш., пазбегнуць памылак пры праектаванні сетак інжынерных камунікацый і кіравання, маршрутаў пракладкі трас інжынерных камунікацый [18, с. 241–245].

Тэхніка пабудовы драўлянага дома зведала немалыя змены. Калі раней (аж да другой паловы XX ст.) будаваў хату звычайна сам гаспадар, дапамагалі сваякі і суседзі, то ў сучасны перыяд для будаўніцтва запрашаюць спецыялістаў-цесляроў. Многія з іх ўтвараюць брыгады, якія працуюць на спецыялізаваным прадпрыемстве, маюць тыпавыя праекты на выбар заказчыка і ўзводзяць дом пад ключ.

Беларускае вясковае жыллё ў абсалютнай большасці выпадкаў будавалася з круглых ачышчаных ад кары бярвенняў. Часам будавалі з бруса (на поўдні Брэстчыны: Пінскі, Іваноўскі, Столінскі раёны — жыллё з бруса было распаўсюджана найбольш шырока). Шырока выкарыстоўваўся характэрны для ўсходніх славян спосаб замацавання вянкоў хаты ў «чашку» (просты вугал, рускі вугал) з выступамі бярвення за сцены зруба, так званы вугал з астаткам. На працягу XX ст. паступовa распаўсюджваецца вугал без выступаў бярвення (чысты, нямецкі вугал) [1, с. 31–34]. Гэты спосаб злучэння бярвення ў вянок «хаты» пераважае ў старых будынках. У новым жа драўляным будаўніцтве, асабліва ў прыгарадах вялікіх гарадоў, аднаўляецца «просты вугал», які ў цяперашні час лічыцца больш прэстыжным, модным. На думку забудоўшчыкаў, злучэнне бярвення ў просты вугал лепш утрымлівае цяпло і мае сваю непаўторную эстэтыку [1, с. 31–34]. Спачатку рубяць сцены і адначасова ўразаюць уваходныя дзверы і аконныя праёмы (Падруб ды й наруб і сярэдзіну вон, то й сцяна будзе). Шчыліны паміж вянкамі запаўняюць мохам або ільняным пакуллем. Швы латаюць адмысловым герметыкам. У праёмы дзвярэй і вокнаў ўстаўляюць вокны і дзверы прамысловай вытворчасці і запеніваюць іх. Бярвёны звонку і ўнутры апрацоўваюць антысептыкам. Сучаснае жыллё будуецца на трывалых, так званых істужачных, універсальных падмурках, якія дазваляюць арганізаваць паўнавартасны склеп ці цокальны паверх, правесці якаснае ўцяпленне падлогі, зручна размясціць усе інжынерныя камунікацыі.

Дах ўяўляе сабой верхнюю і вельмі важную частку жылля («Свая страха — свая ўцеха», «Дай, Божа, адзежку шытую, а хату крытую») [19, с. 209–212], па народных уяўленнях, яна агароджвае «сваю» засвоеную прастору ад

www.etnolog.org.ua



знешняга, «чужога». У сучасны перыяд у знак завяршэння будаўніцтва новага сядзібнага дома па традыцыі на канёк змяшчаюць вянок з палявых кветак: «Апошні канёк паклалі і адразу ж павесілі вянок, яшчэ даху не было. Дом гатовы. Рабілі гэта для таго, каб у хаце было багацце, і навальніца, каб не ўдарыла ў дом» (служачая, 56 гадоў, г. Наваполацк, 2008 г.). Цесляры са Смаргонскага раёна па завяршэнні будаўніцтва дома ў в. Навасёлкі Мінскага раёна на вільчык прыбілі невялікі шост (1,5 м) з папярочнай планкай і на гэты крыжык павесілі вянок. Была вясна і вянок сплялі з галінак бэзу і кветак дзьмухаўца. Патлумачылі гаспадыні, што яны заўсёды так робяць (як іх дзяды і прадзеды рабілі): «вяночак служыць абярэгам ад злых сіл, каб у хаце былі дабрабыт, багацце» (служачая, 65 гадоў, 2015 г.). Самым распаўсюджаным матэрыялам для пакрыцця даху ў сельскай хаце з'яўляецца шыфер, сучасныя бітумныя дахавыя матэрыялы, металадахоўка. Згодна палявых назіранняў, матэрыял пакрыцця нярэдка выступае паказчыкам заможнасці гаспадароў: больш прэстыжнымі (элітнымі) лічацца керамічная чарапіца, сланцавы і медны дах (апошні часцей выкарыстоўваецца пры будаўніцтве храмаў), гнуткая бітумная чарапіца. Зноў вяртаюцца, уваходзяць у моду экалагічна чыстыя дахі з асінавай і дубовай драніцы, гонты, чаротавы, саламяны дах, асабліва ў аграсядзібах і ў прыгарадных вёсках. Для беларускіх вёсак характэрны пераважна двухсхільны дах, радзей сустракаюцца трохсхільныя і чатырохсхільныя, апошнія яшчэ адзначаны ў старых пабудовах на поўдні Гомельскай вобласці. У 1960—1970-я гады пры ўзвядзенні ў сёлах адміністрацыйных будынкаў, школ, вакзалаў, Палацаў культуры сталі выкарыстоўваць пераважна плоскую форму даху, аднак яна не апраўдала сябе, паколькі не ўлічваліся асаблівасці беларускага клімату. У цяперашні час у Рэспубліцы Беларусь пры рэканструкцыі гэтых будынкаў зноў пераходзяць да скатнага даху з пакрыццём новымі каляровымі дахавымі матэрыяламі. У новых дамах паддашкавае памяшканне (мансарда) ўладкоўваецца пад спальныя або гасцявыя пакоі з вокнамі і выхадам на балкон.

Для беларусаў важнай задачай застаецца уцяпленне дома да зімы. Для ўцяплення жылля, як і раней, робяць двайную падлогу: унізе чорную (чарнавую) з уцяпляльнікам, пакрытым плёнкай, а зверху чыстую падлогу, звычайна драўляную, якая шліфуецца і пакрываецца лакам. Але даволі часта драўляны пол фарбуюць. Сучаснымі матэрыяламі ўцяпляюць дах. Шырокае распаўсюджванне атрымала дэкаратыўная ашалёўка сцен, франтона вагонкай і сайдынгам, з выкарыстаннем колеру ў народнай архітэктуры: фарбуюцца франтон, сцены дома, яго асобныя дэталі: аконныя ліштвы, дзверы. У новых і старых дамах для ўцяплення ўстаўляюцца пластыкавыя, драўляныя вокны з падвойным або нават патройным шклом. З'явіліся новыя віды уцяпляльнікаў — мінеральная вата (каменная базальтавая) або на аснове шкловалакна ў плітах і рулонах, пліты пенаполісцерола. Найбольш экалагічнымі відамі уцяпляльнікаў лічацца керамзіт, пенашкло, экавата (выраблеthe з макулатуры), уцяплянікі на аснове арганічных валокнаў (з лёну, какоса, коркі), драўняных валокнаў. Распаўсюджванне атрымлівае новая канцэпцыя ўзаемадзеяння чалавека з жыллёвай прасторай — «разумны дом», калі чалавек адной камандай задае пажаданую абстаноўку, а аўтаматыка з улікам знешніх і ўнутраных фактараў забяспечвае рэжым працы інжынерных сістэм або асобных тэхнічных прылад [23, с. 228—233].

Традыцыйная драўляная разьба ўпрыгожвае ліштвы вокнаў, аканіцы, вуглы, франтон, вароты. У архітэктурным дэкоры галоўны акцэнт пераносіцца на ліштвы, у першую чаргу надаконные дошкі (у Ветцы іх называюць кароны). Традыцыйнай культуры гэтага рэгіёну ўласцівыя арнаментыка з салярнымі разеткамі і паўкольцамі, вастраканцовымі і рамбічнымі абярэгамі — «стрэламі», стылізаванымі зоаморфнымі і антрапаморфнымі фігурамі. У цэлым ўсходнія рэгіёны рэспублікі выдзяляюцца бо-

www.etnolog.org.ua



льш багатай і разнастайнай архітэктурнай разьбой. Характэрна, што і ў пабудовах з новых матэрыялаў часам захоўваецца традыцыйны самабытны стыль архітэктуры. Традыцыйная драўляная разьба ўпрыгожвае ліштвы вокнаў, аканіцы, франтон, вароты, у арнаменце якіх маюць месца геаметрычныя і раслінныя ўзоры, зоаморфныя і антрапаморфныя фігуры.

Вясковыя хаты сталі больш прасторнымі і высокімі, іх плошча перавышае 60 кв м, а вышыня ад падлогі да столі дасягае 3 м.

Новыя тэндэнцыі з'явіліся і ў афармленні прысядзібных участкаў. У асобных сельскіх населеных пунктах, дзе атрымаў развіццё экалагічны турызм, і прыгарадных зонах вялікіх гарадоў, у аграгарадках пачалі актыўна выкарыстоўвацца элементы ландшафтнага дызайну і малыя архітэктурныя формы (альтанкі, навесы, дэкаратыўныя студні, альпійскія горкі, газоны, дэкаратыўныя вадаёмы, скульптуры). У той жа час працягваецца традыцыя разбіваць перад домам кветнік з кветкамі, ягаднікамі, дэкаратыўнымі і фруктовымі дрэвамі.

У сувязі з павышэннем культурных патрэбаў сельскай насельніцтва ў дачыненні да паўсядзённага побыту адбываецца інтэнсіўная трансфармацыя інтэр'еру. Традыцыйнае дзяленне прасторы ў жылым памяшканні замяняюць пакоі, якія маюць пэўнае функцыянальнае прызначэнне. Звычайна вылучаюць гасцiную (зала), кухню, спальню і дзіцячы пакой. Гасцёўня служыць для адпачынку сям'і, прыёму гасцей. У вясковай хаце па традыцыі вылучаюць чырвоны кут (кут, покут, покуць) — самае пачэснае месца ў жыллі. Тут размяшчаюцца іконы, упрыгожаныя ручнікамі, і стол. Часта побач з абразамі знаходзяцца фатаграфіі членаў сям'і — дзяцей, бацькоў, бабуль і дзядуляў. За абразамі захоўваюць грамнічныя свечкі і асвячоную ў царкве вярбу як абярэг. На святочным застоллі бліжэй да чырвонага кута усаджваюць самых ганаровых гасцей, а на вяселлі — маладых.

У сучасным сядзібным доме, катэджы афармленне інтэр'еру не саступае гарадскому. Неад'емнымі атрыбутамі жылой прасторы сталі тэлевізар, кампутар, музычны і відэацэнтр, хатняя бібліятэка.

Хоць тып традыцыйнай планіроўкі сёння парушаны, руская печ працягвае існаваць у вясковай хаце ў асноўным у невялікіх вёсках. Яна знаходзіцца ў кухні. Маладыя сем'і замяняюць печы плітамі звычайна з ляжанкай і сушкай. Шчыт (грубку, печ) у зале робяць з цэглы і абкладваюць каляровай керамічнай пліткай. Раней печ часта апраналі ў сталёвы «кажух». У апошнія дзесяцігоддзі ўсё шырэй для падрыхтоўкі ежы выкарыстоўваюцца электрычныя і газавыя пліты. Сям'і ў добраўпарадкаваных сядзібных дамах забяспечаны цэнтральным ацяпленнем, газам, іншымі сучаснымі выгодамі. Разам з тым частка сельскіх жыхароў зноў пераарыентавалася на пячное, не адмаўляючыся і ад газавага ацяплення жылля.

Ва ўтылітарным і эстэтычным напаўненні сельскага інтэр'еру жыхары арыентуюцца на мэблю прамысловай вытворчасці, пераважна беларускіх мэблевых прадпрыемстваў, купляюць камплекты кухняў, спальныя гарнітуры, мэблю для залы. Разам з тым у асобных гаспадароў, асабліва ў аграсядзібах, можна ўбачыць мэблю ручной працы з дрэва, а таксама плеценую з лазы, якая зноў уваходзіць у моду. Кожная гаспадыня па меры матэрыяльных магчымасцяў, густу і разумення прыгажосці ўпрыгожвае сваё жыллё («Наша горніца з Богам не спорніцца»), стварае асаблівы мікраклімат у духоўным і матэрыяльным жыцці сям'і. Сцены, як правіла, абклейваюць шпалерамі, столі ў традыцыйнай хаце абшываюць драўнянавалакністымі плітамі, афарбоўваюць у светлыя колеры. На падаконніках вырошчваюць кветкі: фіялкі, герані, кактусы, алое і іншыя.

Характэрна, што ва ўнутранай планіроўцы сельскага жылля ў большай ступені, чым гарадскога, захоўваюцца традыцыі: размяшчэнне прадметаў, афармленне інтэр'ера. У некаторых вясковых дамах па цяперашні дзень стаіць ткацкі станок («кросны»), на якім жанчыны ткуць ручнікі, рознакаляровыя «посцілкі», «хадакі» з мэтай ўпрыгожвання інтэр'ера.

www.etnolog.org.ua



У нашым даследаванні вывучалася меркаванне насельніцтва аб сельскім жыллёвым будаўніцтве, стаўленне да розных тыпаў жылля [5, с. 60, 61]. Большасць рэспандэнтаў станоўча ацэньваюць жыллёвае будаўніцтва ў вёсцы, экалагічную чысціню пабудоў, іх сувязь з прыродай, наяўнасць у новых дамах элементаў народнага дэкору, гарадскіх выгод. Большасці сельскіх жыхароў Віцебшчыны падабаецца вясковае жыццё. Шэсць з дзесяці з іх выбралі жыццё ў вёсцы, прычым часцей за ўсё ў невялікім селішчы, каб весці сваю гаспадарку і каб «ніхто ня замінаў». Кожны чацвёрты (больш маладога ўзросту) пры магчымасці перасяліўся б у горад. Многія аддаюць перавагу драўлянай аднапавярховай хаце з гаспадарчымі пабудовамі (53,2 %). Маладзейшыя рэспандэнты аддаюць перавагу катэджам. Вось некаторыя выказванні вяскоўцаў: «Усё падабаецца ў вёсцы, у горадзе не люблю. Паветра, зямля каля цябе. У горадзе і хвілінкі не магу пражыць» (пенсіянерка, 76 гадоў, в. Мураўшчына, Полацкі раён); «У сельскай мясцовасці ціха, спакойна. Люблю прыроду. Салавей спявае, зязюля кукуе» (пенсіянерка, 61 год, в. Кублішчына, Міёрскі раён). Вяскоўцы з Панямоння, калі б у іх была магчымасць выбару, таксама засталіся б вернымі «роднаму куту», жадалі жыць у аграгарадку (41,8 %) або ў невялікім селішчы (25,4 %). Кожны пяты з іх (22,4 %) марыць пра жыццё ў горадзе. Гараджане арыентуюцца на ўжо ўстояны гарадскі побыт (68,9 %). Некаторыя лічаць, што маглі б жыць у аграгарадку (12,3 %) або ў невялікім селішчы. «У нас у Бярозаўцы ёсць і прыватны сектар, і шматпавярховыя дамы. На беразе Нёмана будуюць свае дамкі і лазні. Турыстаў запрашаюць. Нават замежнікі прыязджаюць. Ім падабаецца прырода, паветра, пікнікі, экскурсіі, рыбалка, паходы ў лес за грыбамі» (адміністратар гасцініцы, г. Ліда). «Калі зарплата добрая і ёсць жыллё, то і ў сяле можна жыць. Вёска Крукава — аграгарадок. Хацела б жыць у аграгарадку, аднак усё ўпіраецца ў працу і яе аплату. Падабаецца мне дом катэджнага тыпу, важна каб былі гаспадарчыя будынкі з сараямі і веранда» (рабочая, 49 гадоў, сярэдняя адукацыя, г. Ліда); «Калі ў горадзе жыць, то мала фізічнай працы, у сельскай мясцовасці неабходна шмат працаваць, асабліва фізічна і гэта вельмі добра. Больш чыстае паветра, шмат зеляніны, экалогія лепш. У сельскай мясцовасці шмат пажылых людзей. Хацеў бы жыць і ў горадзе, і ў вёсцы ў традыцыйным драўляным доме» (майстар, 69 гадоў, г. Віцебск). Многія сённяшнія гараджане адчуваюць настальгію па сваёй малой радзіме, імкнуцца наведваць сваіх бацькоў, дапамагаюць ім у пасадцы і ўборцы ўраджаю. «У вёсцы мае карані, падабаецца мне там, цягне туды, хачу на адпачынак у вёску» (санітарка, 41 год, г. Наваполацк).

У памяці апытаных захаваліся традыцыі, звязаныя з будаўніцтвам: закладка першага вянка (23,4 % рэспандэнтаў), «талака» ва ўзвядзенні хаты (16 %), даху (10,5 %), уваходзіны («улазины») (60,8 %). «На вокнах буслоў дзядуля змайстраваў, каб у хаце была дружба і любоў. На шафе было два пеўніка, каб будзілі рана ўставаць. На наваселле спачатку ката запускалі ў дом, затым самі заходзілі. А праз два тыдні ўваходзіны святкавалі» (служачая, 56 гадоў, г. Наваполацк).

За апошнія пяць год (2010–2015) адток сельскага насельніцтва ў гарады зменшыўся. Амаль у два разы знізілася сальда міграцыі вёска — горад. Прыкметна ажывіўся працэс міграцыі з гарадоў у вёскі як былых сельскіх жыхароў, так і карэнных гараджан. Першыя з іх вяртаюцца ў бацькоўскія гнёзды, рамантуюць ці будуюць новыя сядзібы. Гараджане купляюць дамы ў вёсках, асобныя з іх набываюць разбураныя маёнткі, фальваркі і ўзнаўляюць іх. 2018 год абвешчаны ў Рэспубліцы Беларусь Годам малой радзімы, што, несумненна, вымагае любові кожнага жыхара краіны да роднай зямлі, няспынных клопатах аб ёй.

Пад уздзеяннем сацыяльна-эканамічных працэсаў, урбанізацыі, міграцыі істотна змянілася традыцыйная сістэма рассялення, тыпы сядзібаў. Жыллё беларусаў з’яўляецца важнай часткай сістэмы жыццезабеспячэння народа. З ім звязаны цэлы комплекс абрадаў, звычаяў, светапоглядных уяўленняў.

www.etnolog.org.ua



## Літаратура

1. Беларускае народнае жыллё / [Э. Р. Сабаленка і інш.] ; рэд. В. К. Бандарчык. – Мінск : Навука і тэхніка, 1973. – 125 с.

2. Беларусы. Т. 2 : Дойлідства / [А. І. Лакотка]. – Мінск : Тэхналогія, 1997. – 389 с.

3. Государственная программа возрождения и развития села на 2005–2010 годы. – Минск : Беларусь, 2005. – 94 с.

4. *Жучкевич В. А.* Краткий топонимический словарь Белоруссии / В. А. Жучкевич. – Минск : Изд-во БГУ, 1974. – 448 с.

5. *Касперович Г. И.* Традиции в поселениях, жилищной и хозяйственной застройке // Кто живет в Беларуси /А. Вл. Гурко [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2012. – С. 48–61.

6. *Крылова Е.* В роду не без поместья // Мінская праўда. – 2017. – 18 ліпеня. – С. 1, 9.

7. *Лемцюгова В. П.* Тапонімы распавядаюць: навукова-папулярныя эцюды. – Мінск : Літаратура і мастацтва, 2008. – 416 с.

8. *Локотко А. И.* Белорусское народное зодчество XIX–XX в. // А. И. Локотко. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 286 с.

9. *Локотко А. И.* Поселения, постройки, архитектурные традиции // Белорусы. – Москва : Наука, 1998. – С. 223–287.

10. *Малков И. И.* Архитектура белорусского села: традиции, современное состояние. Перспективы / И. И. Малков, И. Г. Малков. – Гомель : Бел ГУТ, 2016. – 146 с.

11. *Малков И. И.* Архитектурно-планировочная структура агрогородков – отражение преемственности традиций и новых социально-экономических условий // Вестник Брестского государственного технического университета. – 2008. – № 1. – С. 15–19.

12. Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Брэсцкая вобл. : нармат. давед. / І. А. Гапоненка і інш. ; пад рэд. В. П. Лемцюговай. – Мінск : Тэхналогія, 2010. – 319 с.

13. Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Віцеб вобл. : нармат. давед. / У. М. Генкін, І. Л. Капылоў, В. П. Лемцюгова ; пад рэд. В. П. Лемцюговай. – Мінск : Тэхналогія, 2009. – 669 с.

14. Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Гомел. вобл. : нармат. давед. / Н. А. Багамольнікава [і інш.] ; пад агул. рэд. В. П. Лемцюговай. – Мінск : Тэхналогія, 2006. – 382 с.

15. Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Гродзен. вобл. : нармат. давед. / І. А. Гапоненка, В. П. Лемцюгова, Л. Л. Янушкевіч і інш. ; пад рэд. В. П. Лемцюговай. – Мінск : Тэхналогія, 2004. – 471 с.

16. Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Магіл. вобл. : нармат. давед. / І. А. Гапоненка, В. П. Лемцюгова, І. М. Шаруха і інш.; пад рэд. В. П. Лемцюговай. – Мінск : Тэхналогія, 2007. – 407 с.

17. Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Мін. вобл. : нармат. давед. / І. А. Гапоненка, І. Л. Капылоў, В. П. Лемцюгова і інш.; пад рэд. В. П. Лемцюговай. – Мінск : Тэхналогія, 2003. – 605 с.

18. Перспективы развития новых технологий и подготовка инженерных кадров Республики Беларусь: сборник трудов XVI международного научно-методического семинара / под общ. ред. П. С. Пойты, В. В. Тура. – Брест : БрГТУ, 2009. – Ч. 2. – 302 с.

19. Прыказкі і прымаўкі ў дзвюх кнігах. Кн. 1. / рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – 560 с.

20. Сельское хозяйство Республики Беларусь : стат. сборник. – Минск, 2016. – 229 с.

21. *Сергачев С. А.* Народное зодчество Беларуси / С. А. Сергачев. – Минск : Беларуская энцыклапедыя ім. П. Броўкі, 2015. – 559 с.

22. Статистический ежегодник Республики Беларусь, 2016. – Минск, 2016. – 518 с.

23. *Шило И. Н.* Интеллектуальные технологии в агропромышленном комплексе / И. Н. Шило, Н. К. Толочко, Н. Н. Романюк, С. О. Нукешев. – Минск : БГАТУ, 2016. – 336 с.

## Summary

The article considers changes in rural settlements and types of dwelling in the Republic of Belarus. A brief analysis of origins and historical development of the main types of settlements enabled the authoress to show preservation and continuity in fundamental elements of the Belarusian material culture. The authoress mainly describes modern settlements (their placement, sizes, types according to population amount, and layout).

www.etnolog.org.ua



The article characterizes new types of settlement — rural estates (about 1500 rural estates have received the status of rural settlements); agro-estates (there are 2263 agro-estates operating in Belarus, with more than 300 thousand tourists visiting them anniversarily); family estates (there are some 500 families setting up their family estates); farm estates, ecological settlements, as well as their role in today's ethno-cultural processes.

The article notes that the basic principle of a rural settlement planning solution is the functional usage of premises, divided into two zones: a residential district and a production area. A rural settlement's centre usually comprises administrative buildings, educational, cultural and health-care facilities, shopping centres, and religious buildings. A great role in public policy of rural settlements' beautification is given to the social sphere, including the housing development (for instance, 1,511,000 $m^2$ of habitation (or 5.3 flats per 1,000 population) were built in rural settlements in 2015). The dwellings built by estates should have indispensable outer utility and auxiliary rooms, plots of land supplied with necessary engineering infrastructure (gas, running water, electricity). Manufacturing facilities of agro-industrial complexes are placed beyond the borders of rural settlements. Work on renovating and updating the operating facilities, as well as building the new ones, is being carried out at present.

The article also shows changes in Belarusian housing development (its constituent parts), including the usage of building materials and constructions, dwelling arrangement and beautification, decoration of plots of land (the usage of elements of landscape design and small architectural forms), and interior peculiar features. Based on poll data, the article shows population's current attitudes towards new types of dwelling

**Keywords:** settlements, types of settlement, agricultural settlements, family estates, agricultural estates, resettlement, dwelling, peculiar features of interior design.